ГІМН ГІМНАЗІІ

Музыка М.Ходаша Словы Т.Касакоўскай

1.Нашы школьныя зімы і вёсны
На Смаргонскай праходзяць зямлі,
Дзе такія высокія сосны
І блакітныя хвалі Вяллі.

Прыпеў:
Ля гімназіі нашай таполі
Падрастаюць вітаючы нас...
Не забудзем ніколі,
Як прыйшлі мы сюды першы раз.

2.Тут свой клас і свой лёс мы знаходзім,
Той, каторы на свеце адзін,
І з настаўнікам разам праводзім
Шмат шчаслівых і цяжкіх гадзін.

Прыпеў.

3.Пачынаецца наша дарога,
Нібы з чыстай старонкі радок,
А жыццё, што шуміць за парогам,
Нам рыхтуе на заўтра ўрок.

Прыпеў.